# ДРУГІ ВЫКЛАДЧЫК ГЕАГРАФІЧНЫХ І ГІСТАРЫЧНЫХ ДЫСЦЫПЛІН У ГІСТОРЫІ МДУ ІМЯ А. КУЛЯШОВА – ЯЎГЕН БЫЧКОЎ: ДА 130-ГОДДЗЯ З ДНЯ НАРАДЖЭННЯ

**Аляксандр Агееў,**
МДУ імя А. Куляшова, г. Магілёў, Беларусь

Яўген Бычкоў быў у 1918–1923 гг. другім выкладчыкам геаграфіі і гісторыі, другім дырэктарам і першым рэктарам у гісторыі станаўлення і развіцця Магілеўскага дзяржаўнага ўніверсітэта імя А. А. Куляшова. Архіўныя пошукі апошніх гадоў дазволілі праліць святло на этапы ягонага жыццёвага шляху.

Адпаведна даведцы з асабістай справы студэнта С.-Пецярбургскага ўніверсітэта Яўгена Бычкова, ён нарадзіўся 20 студзеня 1887 г. у мястэчку Новы Быхаў Магілёўскай губерні. Нованароджаны быў ахрышчаны праз 12 дзён 1 лютага гэтага ж года ў Нова-Быхаўскай царкве Быхаўскага павету Магілёўскай епархіі, што і зафіксавана ў метрычнай кнізе пад № 26. Ягоны бацька – Іосіф Андрэевіч 1852 г. нараджэння быў асабістым ганаровым грамадзянінам і «народным настаўнікам». З 1 верасня 1875 па 1 жніўня 1888 гг. ён працаваў у Нова-Быхаўскім народным вучылішчы, а з 1 жніўня 1888 г. – Жураўскім народным вучылішчы. Маці – Дар'я Мікалаеўна (дзявочае прозвішча Ждан) нарадзілася ў 1858 г. Яўген меў чатырох братоў і зводную сястру Вольгу [5, арк. 38]. Па пашпарту 1930-х гадоў ён быў беларусам і меў імя па бацьку на рускай мове «Восипович», што яшчэ больш падкрэслівае ягонае беларускае паходжанне [6].



У Новым Быхаве і Жуpaвічах прайшло маленства Яўгена. Населеныя пункты лічыліся мястэчкамі і мелі школы. У дзесяцігадовым узросце ў верасні 1897 г. хлопчык паступіў у першы клас Магілёўскай мужчынскай гімназіі. Дазволілі паспяхова прайсці іспыт, безумоўна, бацькавы ўрокі. А на пач. XX ст. – 7 чэрвеня 1905 г. ва ўзросце 18 гадоў Яўген атрымаў атэстат сталасці аб заканчэнні 8-класнага навучання. Знаёмства з атэстатам сталасці гімназіста паказала, што за час навучання ў Магілёўскай гімназіі паводзіны Яўгена былі «выдатныя», спраўнасць пры наведванні і прыгатаванні ўрокаў, а таксама ў выкананні пісьмовых работ «добрая», стараннасць «добрая», а дапытлівасць да ўсіх прадметаў «значная». Выпрабаванні ў 1905 г. прахадзілі з 2 мая па 4 чэрвеня. Па Закону Божаму за год Бычкову была выстаўлена адзнака «4», а на выпрабаванні Яўген атрымаў «5», па рускай мове – «5» за год (5 на выпрабаванні), логіцы – «5», лацінскай мове – «5 (4)», грэчаскай мове – «4 (4)», матэматыцы – «4 (4)», матэматычнай геаграфіі – «5», фізіцы – «5», гісторыі – «5 (5)», геаграфіі – «5», нямецкай мове – «4 (4)», французскай мове – «4» [5, арк. 34]. Гэта была ягоная ўласная заслуга, вынік стараннасці да рэалізацыі сваіх прыродных здольнасцяў. Узровень ведаў, якія атрымоўвалі гімназісты, быў надзвычай высокім. Паступіць у такую прэстыжную і аўтарытэтную ўстанову было надзвычай няпроста, вучыцца цяжка, а закончыць ганарова. Паспяховае навучанне ў гімназіі сведчыць аб тым, што Яўген меў здольнасці да вучобы, працавітасць і настойлівасць, якія дазвалялі асвойваць курсы навук.

Паспяховае заканчэнне гімназіі давала магчымасці працягнуць навучанне ва ўніверсітэтах. Па атрыманні сярэдняй адукацыі 5 жніўня 1905 г. Яўген падаў прашэнне на імя рэктара С.-Пецярбургскага ўніверсітэта і быў залічаны ў студэнты фізіка-матэматычнага факультэта. Бацькі не маглі аказаць істотную дапамогу свайму сыну. У сям'і і без гэтага хапала клопатаў і матэрыяльных выдаткаў. Згодна пасведчанню Дырэкцыі народных вучылішчаў 10 верасня 1905 г. нягледзячы на 29 гадоў працы Іосіф Бычкоў ніякай рухомай маёмасці не меў і пражываў са шматлікім сямействам на жалаванне 250 рублёў у год, або 20 руб. 83 кап. у месяц. У дакументах прама пісалася, што бацькі «людзі бедныя». Мяркуючы па паштоваму штэмпелю Яўген і яго сям'я пражывалі на Лупалава ў доме Гараніна па Лагернаму зав. Ня дзіўна, што ўжо ў верасні студэнт падаў прашэнне аб прызначэнні яму грашовай дапамогі і аб вызваленні ад аплаты за навучанне «в связи с крайним бедственным положением», якое было задаволена [5, арк. 5, 40, 53].



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

У наступным 1906 г. Я. Бычкоў быў пераведзены з матэматычнага на філалагічны факультэт. Што паслужыла галоўным аргументам для змены спецыяльнасці пакуль не высветлена. З аднаго боку вучыцца на факультэтах дакладных навук заўсёды было цяжка. Але магчыма сыграла сваю ролю і змена грамадска-палітычных настрояў будучага «лідэра меншавікоў» Магілёўшчыны. Яўген паступіў ва ўніверсітэт у год першай рускай рэвалюцыі. Асноўныя рэвалюцыйныя падзеі разварнуліся тут зімой – вясной, і да лета горад здаваўся ўціхаміраным. Тым не менш, вучоба ў С.-Пецярбургу ў гады першай рускай рэвалюцыі не магла не адбіцца на характары і памкненнях студэнта.

У справе захоўваюцца запыты апекуноў Віленскага і Кіеўскага навучальных акруг аб маральных якасцях і паводзінах Я. Бычкова ў сувязі з хадайніцтвам ім настаўніцкіх пасад у акругах. 21 чэрвеня 1911 г. рэктар С.-Пецярбургскага ўніверсітэта адказаў, што іх былы студэнт «ни в чем предосудительном замечен не был и является вполне подготовленным к педагогической деятельности» [5]. Апошняе сцвярджэнне дастаткова цікавае і, нават, парадаксальнае, бо ў кантрольна-наглядной справе на Я. І. Бычкова ў архіве КДБ па Магілёўскай вобласці сцвярджаецца, што з 1903 па 1922 гг. ён з'яўляўся членам партыі РСДРП (належаў да яе меншавіцкай частцы). Калі верыць справе, то ён быў адным з лідэраў Магілёўскай губернскай арганізацыі меншавікоў і за гэтую дзейнасць неаднаразова арыштоўваўся органамі ЧК і ДПУ. Чарговы раз Яўген Іосіфавіч быў арыштаваны 3 верасня 1937 г. Магілёўскім РА НКУС БССР. У віну яму зноў ставілася як меншавіцкае мінулае, так і трацкісцкая дзейнасць [2]. Або малады Яўген быў добрым канспіратарам, і ягоную рэвалюцыйную дзейнасць не выявілі шпіёны царскай паліцыі і выхавальнікі гімназіі, а затым і ўніверсітэта, ці нешта надумана было ў справе 1937 г.



У паўночнай сталіцы 19 лютага 1910 г. Яўген Іосіфавіч ажаніўся на Аляксандры Рыгораўне Багданавай. Абодва былі праваслаўнымі і першашлюбнымі. Таінства вянчання ў царкве Св. Таццяны пры Ларынскай гімназіі С.-Пецярбурга 19 лютага 1910 г. здзейсніў свяшчэннік Канстанцін Агееў. Жаніху было 22 гады, нявесце – 21 год [7, арк. 50 аб.-51]. У асабістай справе Бычкова ў фондзе С.-Пецярбургскага ўніверсітэта захавалася два ягоныя партрэты. Рабіліся яны для канцылярскіх спраў і знаходзяцца ў некалькіх копіях [5, л. 1, 20].

Па стану здароўя Яўген быў ваенаабавязаным. Захавалася перапіска ведамстваў аб ягонай ваеннай прапісцы. У сувязі з паступленнем ва ўніверсітэт вучобай Яўген атрымаў адтэрміноўку ад службы ў войску да прызыву 1914 г. [5, арк. 41].

Пасля пяці гадоў вучобы 19 мая 1910 г. малады спецыяліст атрымаў выпускное пасведчанне аб праслухоўванні ім поўнага курсу навук гісторыка-філалагічнага факультэта, які сведчыў аб заканчэнні ўніверсітэта і даваў права здаваць дзяржаўныя іспыты на адпаведнасць яго ведаў патрабаванням кваліфікацыі. Пасведчанне Імператарскага С. Пецярбургскага ўніверсітэта за нумарам 2260 сведчыць, што базавая адукацыя Бычкова была гістарычнай, бо ён вучыўся на гістарычным аддзяленні факультэта. Яшчэ пад час вучобы на факультэце Яўген здаваў дадатковыя іспыты на права выкладання ў сярэдніх навучальных установах. Ён паспяхова здаў экзамены па «Уводзінах у параўнаўчае мовазнаўства» і па «Усеагульнай гісторыі літаратуры» яшчэ да атрымання выпускнога пасведчання. А экзамены па «Гісторыі мастацтваў» і па «Гісторыі рускай літаратуры» ён здаваў ў дзяржаўнай выпрабавальнай камісіі ў 1911 г. Такім чынам, будучы педагог фактычна атрымаў яшчэ і філалагічную адукацыю [5, арк. 18, 32Аб].

Бацькі далі сыну адукацыю і цяпер Яўген быў самастойным чалавекам. Становішча ж яго сям'і не стала надта лягчэйшым. Бацька Яўгена – Іосіф Андрэевіч мала чым мог дапамагчы, бо сам выходзіў на настаўніцкую пенсію. Ён па заканчэнні Полацкай настаўніцкай семінарыі амаль 38 гадоў адпрацаваў настаўнікам пачатковых і прыхадскога вучылішчаў Магілёўскай губерні. Апошнія 6 гадоў – у Магілёўскім чацвёртым прыхадскім вучылішчы. Атрымоўваючы 360–480 руб. жалавання на год, настаўнік імкнуўся даць сваім дзецям добрую адукацыю. У 1913 г. яго старэйшы сын Павел вучыўся ў С.-П. Тэхналагічным універсітэце, Іван – у С.-Пецярбургскім гісторыка-філалагічным інстытуце, Мікалай і Аляксандр навучаліся ў Магілёўскай мужчынскай гімназіі. Іосіф Андрэевіч прасіў у кіраўніцтва Віленскай вучэбнай акругі дапамогі – выплаты яму ўведзеных з 1913 г. пяцігадовых надбавак за выслугу гадоў. Надбаўкі папя-

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

рэдняй датай выдзелены быць не маглі, але ўпраўленне акругі палічыла магчымым «по снисхождении и крайней бедности просителя» выдзеліць разавую дапамогу ў памеры 100 руб., што павінна было дапамагчы настаўніку дачакацца пенсіі без вострай матэрыяльнай нястачы.

Надалей пачаўся нялёгкі працэс пошуку працы. У 1911 г. у маладой пары нарадзіўся сыночак, якога таксама назвалі Яўгенам. Запыты апекуноў Віленскага і Кіеўскага навучальных акруг у С.-Пецярбургскі ўніверсітэт аб характарыстыках на Бычкова дасылаліся ў сувязі з хадайніцтвам ім настаўніцкіх пасад у гэтых акругах. Не адразу, але праца знайшлася на Радзіме. У верасні 1918 г. ў жыцці Магілёўскага настаўніцкага інстытута адбылася трагічная падзея – заўчасна памёр выкладчык геаграфіі, гісторыі і палітэканоміі Міхал Рыгоравіч Руднеў. На яго месца ў штат інстытута быў прыняты Яўген Іосіфавіч Бычкоў. Перайшлі да яго і тыя вучэбныя курсы, якія раней выкладаў Руднеў. Уваход у Магілёў 31 кастрычніка 1918 г. войск Чырвонай Арміі прывёў не толькі да пераўтварэння інстытута ў педагагічны, але і да зменаў у кіраўніцтве інстытута. Дырэктар У. Тычынін, як прадстаўнік былой наменклатуры сышоў з пасады, а ўстанову ўзначаліў Я. Бычкоў.

Увесь час стварэння педагагічнага інстытута, пераўтварэння яго ў інстытут народнай адукацыі, а потым у практычны інстытут народнай адукацыі Бычкоў плённа кіраваў установай. У найцяжэйшых умовах грамадзянскай вайны і пасляваеннай разрухі ён развіваў матэрыяльную базу, выбіваў фонды і пайкі, запрашаў выкладчыкаў і арганізоўваў побыт студэнтаў, сам выкладаў вучэбныя курсы... Інстытут быў не толькі адукацыйнай, але і выхаваўчай установай. Вышэйшыя органы народнай адукацыі сачылі за тым, каб студэнты адпавядалі «патрабаванням пралетарскага будаўніцтва». На губернскім з'ездзе 1921 г. па народнай адукацыі ў Гомелі ў сакавіку-красавіку 1921 г. старшыня Савета ІНА Я. Бычкоў вымушаны быў у адказ на пытанні падрабязна распавядаць аб тым, што студэнты «у значнай ступені выхадцы з пралетарскай і сялянскай масы, шчыльна звязаны з ёй і нясуць сваю справу служэння пралетарскай масе шляхам дакладаў на палітычныя, рэлігійныя і літаратурныя тэмы ў сценах і па-за сценамі інстытута»", што інстытут уважліва «сочыць за развіццём ідэй аб працоўнай школе» і г. д. [1].

Менавіта дзякуючы кіпучай дзейнасці дырэктара, інстытут не быў пераведзены ў 1921 г. у г. Гомель. Бычкоў у 1921 г. узначаліў барацьбу педкалектыву і студэнтаў за захаванне інстытута ў Магілёве. Гомельскія губернскія ўлады настойвалі на ўтварэнні ПІНА ў Гомелі, а магілёўскія ішлі ў іх на павадку. Па сутнасці, адзінай установай, якая выступіла супраць такога рашэння, быў Магілёўскі інстытут. Інстытут застаўся існаваць ў Магілёве. Але ўжо 18 кастрычніка 1921 г. Савет інстытута адзінагалосна хадайнічаў перад ГубЧК аб вызваленні з-пад варты старшыні Савета інстытута Я. Бычкова. «Як незаменнага члена Савета, які адзін знаходзіўся ў курсе спраў фінансавага і вучэбнага характара». Што стала падставай для арышту дырэктара? Яго дзейнасць па захаванні інстытута ў Магілёве (што вельмі верагодна) ці нейкія іншыя прычыны, сказаць цяжка. Да гонару калектыву ІНА адзначым, што нягледзячы на арышт, на гэтым Савеце Я. Бычкоў быў абраны, так бы мовіць завочна, на тыя кафедры, на якіх ён раней планаваў працаваць [1, с. 58–60].

Копія ліста рэктара ПІНА, знойдзеная намі ў музее Магілёўскага педагагічнага каледжа, дапамагла ўстанавіць, што да самага закрыцця практычнага інстытута ў 1923 г. ім кіраваў па ранейшаму Я. Бычкоў. Гэта дазваляе канстатаваць факт вызвалення яго пасля арышту 1921 г. Магчыма зварот педкалектыва сыграў тут рашаючую ролю. Дадзены ліст падпісаны Бычковым як рэктарам інстытута. Такім чынам, пасада рэктара ўпершыню з'явілася значна раней, чым традыцыйна прынята было лічыць.

Матэрыяльная база практычнага інстытута перайшла ў 1923 г. да педтэхнікума, які спачатку ўзначальваў Бычкоў. Большасць выкладчыкаў інстытута таксама напачатку працавала у ім. У тэхнікуме Бычкоў па ранейшаму выкладаў гісторыю. Але ўжо на працягу першага года дзейнасці педтэхнікума, у яго з'явіўся новы дырэктар. Сляды лёсу ж Я. Бычкова знаходзяцца ў Гомельскіх органах кіравання адукацыяй, куды яго перавялі па службе. А ў канцы 1930-х гг. ён працаваў загадчыкам уліковай часці аддзела кадраў Магілёўскай фабрыкі валакна і выкладаў гісторыю на вячэрнім рабфаку.

Чарговы раз Яўген Іосіфавіч быў арыштаваны 3 верасня 1937 г. Магілёўскім РА НКУС БССР. Перад арыштам ён пражываў па вул. Быхаўскай 27. Абвінавачваўся Бычкоў у антысавецкай агітацыі і прапагандзе па арт. 72 КК БССР. У віну яму ставілася як меншавіскае мінулае, так і трацкіская дзейнасць. Праз 6 дзён пасля арышту 9 верасня Асобай тройкай НКУС БССР Я. І. Бычкоў быў прыгавораны да вышэйшай меры пакаран-



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

ня, а растраляны 4 лістапада 1937 г. Так, ва ўзросце 50 гадоў скончылася жыццё першага ў гісторыі МДУ рэктара. Рэабілітаваны ён быў толькі 16 студзеня 1989 г.

Дзякуючы правядзенню ў 2014 г. выставы дакументаў па гісторыі МДУ імя А. Куляшова, у т. л. дэманстрацыі фотаздымкаў гімназіста і студэнта Бычкова, выявіліся наступныя акалічнасці біяграфіі стваральніка першага ВНУ г. Магілёва. Тэлевізійны рэпартаж аб гэтай падзеі трансляваўся па Беларусі. І праз некалькі дзён знайшліся ўнукі і праўнукі другога географа і гісторыка нашай установы, якія сёння пражываюць у Светлагорску Гомельскай вобласці.

Знаёмства з біяграфія Яўгена Бычкова паказвае, што ён не быў прафесійным географам. Па адукацыі ён быў гісторыкам, а таксама здаў экзамены на права выкладання філалагічных прадметаў. Але паступіў ён на працу ў настаўніцкі інстытут не толькі як выкладчык гісторыі, палітэканоміі, але і геаграфічных дысцыплін. Ужо з 1918 г. Бычкоў ачоліў інстытут і далей выкладаў грамадазнаўчыя прадметы і педагогіку. Нягледзячы на тое, што выкладанне геаграфіі Я. Бычковым не было доўгім, ён павінен лічыцца другім па ліку выкладчыкам геаграфічных дысцыплін у гісторыі МДУ імя А. Куляшова.

**Літаратура:** 1. Агееў А.Р. Да гісторыі дзейнасці інстытута народнай адукацыі у Магілёве / А. Р. Агееў // Весник Могилевского государственного университета им. А.А. Кулешова. – 2000. – № 1. – С. 51 – 60. 2. Агееў, А. Р. Невядомыя старонкі жыцця першага рэктара Магілёўскага дзяржаўнага універсітэта / А. Р. Агееў // Куляшоўскія чытанні. Мат. Міжнар. навук. канф. 11 – 12 снежня 2003 г.: Тэзісы дакладаў. У 2-х ч. Ч. 1. – Магілёў: МДУ імя А.А. Куляшова, 2004. – С. 8 – 10. 3. Агееў, А. Р. Новыя старонкі біяграфіі стваральніка першай вышэйшай навучальнай установы г. Магілёва Я. І. Бычкова / А. Р. Агееў // Романовские чтения – 9: сб. статей Международной науч. конференции / под общ. ред. Н. М. Пурышевой. – Могилев: МГУ имени А. А. Кулешова», 2013. – с. 17–18. 4. Бычков // Літоўскі дзяржаўны гістарычны архіў. – ф. 567, воп. 17, спр. 125. 5. Бычков Евгений Иосифович // Центральный исторический архив Санкт-Петербурга. – ф. 14, оп. 3, д. 44181. 6. Кантрольна – надзорная справа № 9737 сн. // Архіў УКДБ РБ па Магілёўскай вобласці. 7. Метрическая книга церкви Святой Татьяны при Ларинской гимназии за 1910 г. // Центральный исторический архив Санкт-Петербурга. – ф. 19, оп. 127, д. 2378.

*Артыкул паступіў у рэдакцыю 21 лістапада 2016 г.*
*Рэцэнзент – І.М. Шаруха, прафесар кафедры прыродазнаўства МДУ імя А. Куляшова (г. Магілёў, Беларусь)*

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова